**І.А.Чупракова,** *аспірантка,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# БІБЛІЯТЭКА ЯК СУБ’ЕКТ ФАРМІРАВАННЯ ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ АСОБЫ: АКСІЯЛАГІЧНЫ ПАДЫХОД

Адпаведнасць дзейнасці бібліятэк сфарміраванай у грамадстве сістэме каштоўнасцей як неад’емнага атрыбута знешняга асяроддзя з’яўляецца адной з дэтэрмінантаў іх паспяховага функцыянавання.

У якасці асновы дзейнасці бібліятэк арыентацыя на агульначалавечыя каштоўнасці разглядаліся Т.Ф.Берастававай, М.Я.Дворкінай, Л.А.Дзямешка, І.В.Лукашовым, В.І.Харламавым, Л.Б.Хаўкінай, аксіялагічныя дэтэрмінанты прынцыпаў дзейнасці бібліятэк абгрунтаваны Р.С.Матульскім. Зыходзячы з іерархіі асноўных груп каштоўнасцей, ім вылучаны галоўныя прынцыпы дзейнасці бібліятэк, гэта перш за ўсё адпаведнасць агульначалавечым каштоўнасцям, нацыянальным каштоўнасцям, групавым і індывідуальным [1, с. 55].

Аксіялагічны аспект дзейнасці бібліятэк як суб’ектаў фарміравання прававой культуры асобы патрабуе разгляду гэтай праблемы ў кантэксце не толькі бібліятэказнаўства, але і з пазіцый сацыяльнай філасофіі, сацыялогіі, педагагічнай і юрыдычнай навукі. Сучасная сацыякультурная сітуацыя, змена парадыгмаў грамадскага развіцця, палітычныя і эканамічныя трансфармацыі, тэхнагенныя і прыродныя катаклізмы прыводзяць да пераасэнсавання многіх агульначалавечых каштоўнасцей, назапашаных і захаваных чалавецтвам. Бібліятэка як сацыяльны інстытут, займаючы вядучае месца ў працэсе распаўсюджвання інфармацыі, перш за ўсё арыентуецца на адпаведнасць духоўным агульначалавечым каштоўнасцям як аднаго з прыярытэтаў сваёй дзейнасці. Даючы карыстальнікам інфармацыю аб змесце кожнага ўзроўню і групы каштоўнасцей, ствараючы ўмовы для іх вывучэння, бібліятэка становіцца суб’ектам фарміравання сацыяльных каштоўнасцей індывідаў, груп, нацый і ўсяго грамадства.

Гісторыя чалавецтва сведчыць, что сістэма каштоўнасцей грамадства і яго суб’ектаў здольна змяняцца. Прынятыя за аснову жыццядзейнасці каштоўнасці не заўсёды з’яўляюцца фундаментальнымі, яны прыдатныя да перагляду ў залежнасці ад іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маральнай афарбоўкі ў той ці іншы перыяд існавання асобы. Для таго, каб новыя каштоўнасці: незалежнасць, грамадзянская годнасць, сацыяльная актыўнасць, талерантнасць, ініцыятыўнасць і іншыя – былі імпліцыраваны ў грамадства, неабходна перабудаваць каштоўнасную свядомасць індывідаў з арыенцірам на паважлівае стаўленне да права як рэгулятара грамадскіх стасункаў і сістэму каштоўнасцей.

Права адносіцца да ліку фундаментальных каштоўнасцей чалавечай культуры. Цікавасць да аксіялагічнага аспекту гэтага феномена значна ўзрасла ў апошнія дзесяцігоддзі, аб чым сведчыць актывізацыя навуковых даследаванняў як у юрыдычнай супольнасці, так і ў галіне сацыяльнай філасофіі і сацыялогіі. Педагагічныя пошукі ў плоскасці гэтай праблемы характарызуюцца даследаваннямі па праблемах прававога выхавання; вызначэннем ролі каштоўнасных аспектаў права ў выхаванні асобы; пошукам асноў фарміравання прававой кампетэнтнасці падрастаючага пакалення; вызначэннем сутнасці маральна-прававой культуры як педагагічнай катэгорыі. У педагагічнай навуцы распрацоўваюцца пытанні фарміравання псіхолага-педагагічных аспектаў прававой свядомасці, апрабіруюцца тэхналогіі фарміравання прававой культуры моладзі, абгрунтоўваюцца педагагічныя ўмовы фарміравання маральна-прававой культуры будучых педагогаў (А.П.Белікава, В.В.Грынкевіч, Л.М.Матвіенка, П.А.Мусінаў, Г.І.Паддубская, Т.А.Парафіяновіч, А.В.Пячынская, Л.І.Смагіна, І.А.Царык, А.Ф.Чараднічэнка, інш.). Узнікла і развіваецца педагогіка права – новы кірунак у сучаснай педагогіцы, які займаецца вывучэннем пытанняў выхавання і навучання, пабудаваных на прынцыпе “правы чалавека абсалютныя, інтарэсы дзяржавы адносныя” [2, с. 109].

Права ўяўляе каштоўнасць, уключаную ў сацыяльную рэальнасць, і выяўляе меру свабоднага развіцця асобы і грамадства ў цэлым. Каштоўнасныя ўласцівасці права абумоўлены прыродай гэтай спецыфічнай з’явы, яго значэннем як асобай формы грамадскіх стасункаў, месцам і роляй у сацыянарматыўнай сістэме грамадства, яго сутнасцю як каштоўнаснага феномена ў працэсе сацыялізацыі асобы. Прававыя каштоўнасці фарміруюцца пры засваенні сацыяльна-прававога вопыту і праяўляюцца на ўзроўні прававой культуры асобы. Аксіялагічны падыход прадугледжвае інтэрпрэтацыю прававой культуры як сістэмы нормаў і каштоўнасцей, прызнаных у грамадстве і звязаных з лепшымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнымі традыцыямі, гуманізмам як глабальным светапоглядам. Дадзены падыход дазваляе вызначыць права як каштоўнасць соцыуму, што ўяўляе сабой рэальна функцыянуючы рэгулятар чалавечай дзейнасці, які ўтварае ўнутраны каркас яго культуры [3, с.8].

На фоне сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, што характарызуецца нарастаючай напружанасцю грамадскага жыцця, стыхійнай сацыялізацыяй і ўскладненнем працэсаў самаарганізацыі паводзін чалавека, узнікненнем праблем сацыяльна-педагагічнага аспекту, актуалізаваліся пытанні філасофскага асэнсавання каштоўнасці права як індыкатара цывілізаванасці грамадства. Вядома, што такія каштоўнасці беларускага грамадства, як талерантнасць, незалежнасць, ініцыятыўнасць, сацыяльная актыўнасць, грунтуюцца на свядомасці грамадзян з арыенцірам на паважлівае стаўленне да права, таму што карэнныя пераўтварэнні ў грамадстве не могуць быць жыццядзейнымі без трансфармацыі прававой свядомасці людзей.

Сацыяльная значнасць гэтай нацыянальнай праблемы значна ўзрасла ў апошнія гады, у сувязі з чым не толькі ў юрыдычным, але і педагагічным, і бібліятэчным супольніцтве сталі абмяркоўвацца праблемы фарміравання і павышэння прававой культуры насельніцтва, скіраваныя на актывізацыю суб’ектаў прававога выхавання насельніцтва[1].

З пазіцыі бібліятэказнаўства аксіялагічны аспект дзейнасці бібліятэк у якасці суб’ектаў фарміравання прававой культуры дэтэрмінуецца арыентацыяй на права як неад’емны каштоўнасны атрыбут грамадскіх стасункаў. Аксіялагічны аспект прававога развіцця асобы ва ўмовах бібліятэкі вызначае дамінанты дзейнасці бібліятэк у фарміраванні наступных каштоўнасцей: павага да сваіх правоў і правоў іншых, сумленнасць у сацыяльным партнёрстве, талерантнасць, сацыяльная актыўнасць, крытычнасць і інш.

Стварэнне публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ) на базе бібліятэк з мэтай прадастаўлення неабмежаванага доступу ўсім катэгорыям насельніцтва да афіцыйнай аператыўнай прававой інфармацыі, фарміравання прававых ведаў і станоўчага стаўлення

[1] Напр.: Абласны семінар “Дыстанцыйная прававая дапамога насельніцтву раённых цэнтраў і аграгарадкоў Гродзенскай вобласці” (16–17 снежня 2008 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Праблемы фарміравання прававой культуры моладзі на сучасным этапе” (Віцебск, 22–24 красавіка 2009 г.); Канферэнцыя “Прававая дапамога насельніцтву Гродзеншчыны: практыка супрацоўніцтва НЦПІ, публічных бібліятэк і клінікі права” (30 чэрвеня 2009 г.); Гарадскі педагагічны форум работнікаў устаноў адукацыі сталіцы “Будучыню Беларусі выхоўваем разам!” (28 жніўня 2009 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да права выклікала новыя параметры ўзаемадзеяння са знешнім асяроддзем. Актывізацыя дзейнасці публічных бібліятэк у кірунку папулярызацыі прававых ведаў, стымулявання попыту на прававую інфармацыю сярод рэальных і патэнцыяльных карыстальнікаў азначыла новы этап іх развіцця як суб'ектаў сістэмы прававой асветы насельніцтва.

Сацыяльна-педагагічны патэнцыял публічнай бібліятэкі, на базе якой функцыянуе ПЦПІ, дазваляе нам характарызаваць яе як *каштоўнасна арыентаваную сістэму фарміравання прававой культуры асобы, пэўнай групы, грамадства ў цэлым*. Эфектыўнасць дзейнасці такой сістэмы забяспечваецца спалучэннем яе інфармацыйнага, аксіялагічнага і дзейснага кампанентаў.

*Інфармацыйны кампанент* – гэта матэрыяльны падмурак, базіс працэсу прававой сацыялізацыі, зместам якога з'яўляюцца прававыя веды, сацыяльная памяць, юрыдычныя тэхналогіі. Інфармацыйны кампанент забяспечваецца фарміраваннем унутранага нонэлектроннага і электроннага дакументнага рэсурсу прававой тэматыкі, выкарыстаннем адпаведнага нонэлектроннага фонду іншых бібліятэк, рэсурсаў Інтэрнета. Гэты кампанент уключае ДБА – сукупнасць даведачных і бібліяграфічных выданняў, неабходных для ажыццяўлення бібліяграфічнай дзейнасці, каталогі і картатэкі, базы даных, уласную бібліяграфічную прадукцыю.

*Аксіялагічны кампанент* забяспечвае працэс фарміравання каштоўнасна-прававых установак асобы, глыбокага асэнсавання індывідам каштоўнасці права, у выніку чаго ажыццяўляецца выбар правамерных паводзін. Ён заключаецца ў канцэнтрацыі намаганняў на працэсе фарміравання ўнутранай патрэбнасці чалавека ў правамерных паводзінах, заснаванай на каштоўнасным успрыманні права. Аксіялагічны кампанент стымулюе фарміраванне адносін да праяўленняў прававой рэчаіснасці, нормаў права, дазваляе ацэньваць свае і чужыя прававыя паводзіны, учынкі і іх наступствы. Рэалізацыя аксіялагічнага кампанента забяспечваецца псіхолага-педагагічнай дзейнасцю бібліятэкі, яе інтэлектуальнымі рэсурсамі (тэарэтычнымі і метадычнымі распрацоўкамі, інфармацыйнай і прававой культурай бібліятэкараў). Аксіялагічны кампанент звязаны са змястоўнай дзейнасцю бібліятэкі па абслугоўванні карыстальнікаў прававой інфармацыі (вызначэнне адпаведнай мэты дзейнасці і тэматыкі мерапрыемстваў), а таксама з выбарам бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў, паслуг, формаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадаў і сродкаў задавальнення інфармацыйна-прававых патрэбнасцей карыстальнікаў (выставы прававой літаратуры, гадзіны і дні прававой інфармацыі, брэйн-рынгі, школы прававых ведаў, рэкамендацыйная бібліяграфія і інш.).

*Дзейсны кампанент* азначае стварэнне ўмоў для ўключэння карыстальнікаў у сацыяльную практыку, дзе яны змогуць выкарыстаць свае веды і ўменні, выпрацаваць навыкі выкарыстання прававых ведаў у сваёй дзейнасці. Гэты кампанент рэалізуецца пры стымуляванні актыўнасці асобы ў правядзенні комплексных мерапрыемстваў на базе бібліятэкі, у рэалізацыі мясцовых праектаў і праграм з удзелам прадстаўнікоў мясцовых органаў кіравання, праваахоўных органаў, службаў сацыяльнай абароны насельніцтва, педагогаў і псіхолагаў, юрыстаў. Удзел у прававой дзейнасці грамадскіх арганізацый, іншыя віды сацыяльнай актыўнасці дазваляюць асобе стаць паўнапраўным суб’ектам прававых стасункаў, адчуць грамадзянскую годнасць, самастойнасць і незалежнасць.

Такім чынам, дзейнасць публічных бібліятэк як суб’ектаў фарміравання прававой культуры надае ім параметры каштоўнасна арыентаванай сістэмы, якая ўключае інфармацыйны, аксіялагічны і дзейсны кампаненты. Сацыяльна-педагагічны аспект яе дзейнасці тлумачыцца комплексным уздзеяннем на асобу з мэтай фарміравання адпаведнай сістэмы каштоўнасцей і матываў паводзін, набыцця неабходных для паўнавартаснай жыццядзейнасці прававых ведаў і ўменняў, выхавання талерантнасці, патрэбы выкарыстоўваць гуманныя сродкі вырашэння канфліктаў, развіцця пачуцця салідарнасці і імкнення да супрацоўніцтва.

Пастаноўка асобы ў цэнтр бібліятэчнага ўздзеяння, зварот да сістэмы каштоўнасцей, звязанай з дэмакратызацыяй адносін, лепшымі нацыянальнымі традыцыямі і з улікам спецыфікі менталітэту беларускага грамадства прыводзяць да актывізацыі матывацыйна-ацэначнага кампанента ў структуры прававой кампетэнтнасці асобы. Паколькі адной з вядучых сіл паводзін і развіцця асобы выступаюць яе каштоўнасныя арыентацыі (побач з патрэбнасцямі і матывамі), то актывізацыя працэсу прававой сацыялізацыі ва ўмовах бібліятэкі ўзмацняе сацыяльна-педагагічны патэнцыял яе дзейнасці, падкрэслівае гуманістычную сутнасць.

Аксіялагічны аспект у дзейнасці публічных бібліятэк як суб’ектаў фарміравання прававой культуры асобы павінен быць заснаваны на фарміраванні і вызначэнні месца прававых каштоўнасцей у асобаснай іерархічнай структуры каштоўнасцей, у свядомасці і светапоглядзе грамадзяніна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Мотульский, Р.С.* Общее библиотековедение: учебное пособие для вузов / Р.С.Мотульский. – М.: Либерея, 2004. – 224 с.

2. *Коджаспирова, Г.М.* Педагогический словарь / Г.М.Коджаспирова, А.Ю.Коджаспиров. – 2-е изд., перераб. – М.: Академия, 2005. – 176 с.

3. *Моджина, Н.В.* Право как ценность и его роль в воспитании личности: автореф. дис. …канд. филос. наук: 09.00.11 / Н.В.Моджина. – Уфа, 2006. – 20 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ